№ 11 (880)
Сакавік 2022 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

kazeta.by bfk.by

**Сябры! Заканчваецца падпіска на II квартал 2022 г. Не адкладайце справу на апошні дзень. Падпішыцеся на «Краязнаўчую газету» самі, падпішыце сяброў і родных – зрабіце ім падарунак.**

# «Кніжныя скарбы з манастырскага куфра»

*10 сакавіка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава-прэзентацыя, на якой упершыню прадстаўлены шырокай публіцы сапраўдны кніжны скарб, што нядаўна быў адшуканы ў адным са старадаўніх беларускіх манастыроў.*

З прывітальным словам на адкрыцці выступіў намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Суша. Ён распавёў пра незвычайную знаходку. Унікальныя кніжныя скарбы былі выяўлены ў 2021 г. пад час наведвання ім разам з Аляксандрам Горным і Таццянай Сапега колішняга гродзенскага брыгіцкага кляштара. Вынікам знаёмства і размовы з а. Антоніем Грэмзам стала адна абсалютна ўнікальная знаходка, што ўяўляе сабой частку тыражу двух выданняў – «Статута ордэна брыгітак» 1673 г. і «Брэвіярыума» 1748 г., якая не прайшла адпаведную апрацоўку і засталася ў стосах з асобных аркушаў. Каштоўнасць была перададзена ў галоўную бібліятэку краіны.

Бібліяфіл і калекцыянер Алег Судлянкоў адзначыў, што экспанаты выставы даюць магчымасць уявіць тэхналогію кнігадрукавання і ўбачыць якасную паперу ручнога вырабу. Ён падкрэсліў, што прынцып кнігадрукавання заставаўся нязменным на працягу многіх стагоддзяў.



Напрыканцы мерапрыемства гісторык Алег Дзярновіч расказаў пра былы брыгіцкі манастыр у Гродне, дзе былі адшуканы кніжныя скарбы, і настаяцеля касцёла – аматара даўніны а. Антонія Грэмзу.

Наведвальнікаў выставы чакае ўнікальная магчымасць убачыць незвычайную з'яву – па сутнасці, фрагмент архіва старадаўняй друкарні: неразрэзаныя і незброшураваныя аркушы XVII і XVIII стагоддзяў, падрыхтаваныя для далейшай працы пераплётчыкаў. На кожным з вялікіх друкарскіх аркушаў размяшчалася па восем старонак тэксту, якія ў далейшым павінны былі адпаведным чынам складвацца ў асобныя сшыткі, перашывацца разам, абразацца і пераплятацца ў прывычную нам сёння форму кнігі-кодэкса.



*Антоній Грэмза і Аляксандр Суша*

Па невядомых прычынах частка тыражу двух выданняў не прайшла адпаведную апрацоўку і засталася ў стосах з асобных аркушаў, якія на працягу некалькіх стагоддзяў захоўваліся ў брыгіцкім кляштары. Дзякуючы ўнікальнай для Беларусі знаходцы мы можам атрымаць ўяўленне пра тое, як друкаваліся кнігі ў мінулыя стагоддзі, асэнсаваць і візуальна ўявіць старажытную тэхналогію збірання і пераплёту выданняў. Сёння нават можна гаварыць пра змест і назвы двух выданняў, якія павінны былі атрымаць форму кнігі яшчэ некалькі стагоддзяў таму.

Разам з гэтымі незвычайнымі матэрыяламі са старажытнай друкарні ў Музеі кнігі экспануюцца элементы кніжнага пераплёту і аналагічныя старадрукаваныя кнігі ў «закончаным выглядзе» з фондаў НББ.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*

**Комплекс брыгіцкага кляштара** займае цэлы квартал у цэнтральнай частцы Гродна і складаецца з касцёла, жылога корпуса, арыгінальнага драўлянага лямуса і высокай каменнай агароджы з брамамі і вуглавымі васьміграннымі вежамі. Некалі гэта быў адзіны ў Беларусі храм і кляштар ордэна Святой Брыгіты, пабудаваны на ахвяраванні мясцовага магната К. Весялоўскага ў 1634 – 1642 гг. у стылі барока. Сёння ансамбль кляштара з'яўляецца помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння.



*Фота Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА*

# Хведар Жычка нарадзіўся... «на Марсе»

***20 сакавіка – 95 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца Жлобінскага раёна Хведара Жычкі (1927 – 2007). Ён аўтар многіх кніг паэзіі і прозы, перакладаў. Але сёння хацелася б расказаць не пра яго творчасць, а яго малую радзіму – былы пасёлак Марс, які ў 1962 годзе зліўся з вёскай Гелін цяперашняга Папаратнянскага сельсавета.***

У адным са сваіх лістоў да аўтара гэтага артыкула Хведар Жычка пісаў: «Дваццаць беззямельных сялян вярнуліся з франтоў Грамадзянскай вайны і арганізавалі ў маёнтку Асцерманск (сёння гэта вёска Адраджэнне. – **М.Ш.**) камуну "Ветэран". Але праз некалькі гадоў камуну распусцілі, яе членаў папрасілі выселіцца з панскіх палацаў. Куды? "Хоць на Марс", – адказаў нейкі адукаваны начальнік. Сяляне выклапаталі дазвол на пасяленне ў Мышкоўскім лесе. Адсюль і касмічная назва пасёлка – Марс, дзе я і нарадзіўся».



*Вёска Гелін*

«У пасёлку было мала пісьменных людзей, – расказвае далей Хведар Змітравіч. – Жылі забабоны, вера ў "нячыстую сілу", "вядзьмарства" і сны. Старэйшыя за нас хлопцы і дзяўчаты, якія нарадзіліся яшчэ ў камуне, звычайна заканчвалі не больш 5-6-і класаў, кідалі школу, жаніліся і забывалі ўсё на свеце. Адзін, хто паехаў у горад вучыцца, быў Радзівонаў Колька (будучы беларускі пісьменнік Мікола Лупсякоў (1919 – 1972). – **М.Ш.**)».

Пад час нямецка-фашысцкай акупацыі Хведар Жычка знаходзіўся ў родным пасёлку. Ён пісаў: «Са жніўня 1941 па 1 снежня 1943 г. я жыў у сваім пасёлку Марс, акупіраваны фашыстамі, працаваў на зямлі... Вызваленне прыйшло 1 снежня 1943 года. Утварыўся фронт, і мы аказаліся на самай мяжы, за ўзгоркам... і фашысты абстрэльвалі, і нашы. Насельніцтва не выгналі, яно патрэбна было, каб хоць неяк абслугоўваць чырвонаармейцаў. І так 8 месяцаў... Вясной 1944 года прызвалі хлопцаў 1926 года нараджэння, восенню – 1927-га. Нас прывезлі ў разбіты бамбёжкамі Мінск, пастроілі ў калону і пад музыку "Развітанне славянкі" павялі ва Уручча, дзе нас пераадзелі ў вайсковае аддзенне і размеркавалі ў казармах. Артдывізіён, куды я трапіў, быў самы адукаваны – 7 класаў. Тут трэба было рашаць задачы па фізіцы, матэматыцы...».

***Мікалай ШУКАНАЎ,***
***краязнаўца, г. Жлобін***
***Фота з архіва аўтара***

## На тым тыдні...

### *Ратуемся спадчынай*

✓ **9 сакавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася публічная лекцыя **«Статуты ВКЛ у кантэксце гісторыі права Беларусі»**. Экспертам выступіў кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзімір Падалінскі. На лекцыі абмеркавалі ролю і змест статутаў Вялікага Княства Літоўскага, якія з'яўляюцца не толькі першымі фундаментальнымі зборамі прававых нормаў і выдатнымі творамі юрыдычнай думкі, але і найважнейшымі помнікамі старабеларускай мовы. Менавіта дзякуючы першаму (1529), другому (1566) і трэцяму (1588) статутам ВКЛ увайшло ў кола дзяржаў, у якіх права стала важным элементам рэгулявання грамадскага і дзяржаўнага жыцця.

✓ **10 сакавіка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася часовая літаратурна-мастацкая экспазіцыя **«Фарбы душы»**, прысвечаная 85-годдзю Дануты Бічэль-Загнетавай, 75-годдзю Раісы Баравіковай і 80-годдзю з дня нараджэння Веры Вярбы. Выстава ладзіцца сумесна з секцыяй Беларускага саюза мастакоў «Верасень». На экспазіцыі прадстаўлены творы яркіх прадстаўніц беларускай паэзіі, якія сваёй творчасцю аздобілі і ўзбагацілі беларускую літаратуру другой паловы XX ст. Сярод матэрыялаў выставы – эскізы народнага мастака Беларусі Арлена Кашкурэвіча і кнігі з аўтографамі. Праз іх можна ўбачыць і адчуць талент, душу, прыгажосць слова паэтак. Дапаўняюць і ўпрыгожваюць экспазіцыю працы вядомых мастачак Марыны Эрэнбург, Веранікі Віткоўскай, Алы Калосенцавай, Ларысы Зарубінай. Кожная з іх у сваёй творчасці аддае даніну тэме адраджэння і аднаўлення прыроды, прыгажосці і гармоніі.

Выстава будзе працаваць па 2 мая.

✓Выстава **«Да 130-годдзя з дня нараджэння Алеся Гаруна»** адкрылася **11 сакавіка** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Яна прысвечана выдатнаму беларускаму пісьменніку Алесю Гаруну (сапр. Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі, 1887 – 1920). Лёс А. Прушынскага склаўся трагічна, на працягу дзесяці гадоў ён быў адарваны ад свайго асяроддзя, ад роднай зямлі, у 1908 г. за рэвалюцыйную дзейнасць быў высланы ў Сібір. Вярнуўся на радзіму пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. хворым на сухоты, дзе пражыў толькі тры гады. Займацца літаратурнай творчасцю мог толькі ў няволі, а пад канец жыцця – ва ўмовах разбуральнай вайны. Забаронены ў час барацьбы з «нацдэмаўшчынай», ён стаў неад'емнай часткай літаратурнага працэсу толькі на мяжы 1980 – 1990 гг. Алесь Гарун пакінуў след у паэзіі, прозе, драматургіі, стаў адкрывальнікам новых тэмаў і жанравых формаў. М. Багдановіч пісаў у 1914 г., што сярод паэтаў Алесь Гарун «вымалёўваецца ў самастойную адзінку», што ён «знайшоў свае асобыя рытмы і час ад часу радуе нас вытанчанай арыгінальнасцю верша». На выставе дэманструюцца асноўныя творы Алеся Гаруна, а таксама пераклады твораў на балгарскую, нямецкую, польскую, рускую і ўкраінскую мовы. Адзіны паэтычны прыжыццёвы зборнік Алеся Гаруна «Матчын дар: думы і песні, 1907 – 1914 г.» выйшаў у 1918 г. На выставе прадстаўлены проза, публіцыстыка пісьменніка, якія па праве складаюць залатую калекцыю беларускай літаратуры. Вялікі раздзел пазнаёміць з літаратурай аб жыцці і творчасці Алеся Гаруна.

✓**11 сакавіка** ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку адбылася прэзентацыя другога выдання кнігі С. Капыла **«Урочище Пески – территория смерти»**. У кнізе змешчаны новыя ўспаміны непасрэдных удзельнікаў трагедыі, архіўныя звесткі і дадзеныя нямецкай аэрафотаздымкі 1943 г., якія дазваляюць удакладніць падзеі ў акупаваным Полацку ў 1941 – 1944 гг. Урочышча Пяскі – гэта знакавае для кожнага палачаніна месца, дзе пахаваны дзясяткі тысяч савецкіх людзей: ваеннапалонных, падпольшчыкаў і мірных жыхароў, якія загінулі ад рук нацыстаў і іх пасобнікаў. На старонках выдання – імёны многіх людзей, каго лёс звязаў з гэтым месцам, а таксама тых, хто ўносіў добраахвотныя ахвяраванні на будаўніцтва мемарыяла.

✓У Ружанскім палацавым комплексе роду Сапегаў **10 сакавіка** адкрылася выстава **«Нябёсная варта Беларусі»**. На ёй прадстаўлена калекцыя абразоў праекта «Куфар старажытнасцяў» (прыватны збор музеязнаўца, экскурсавода Паўла Каралёва). Хрыстос, Багародзіца, святы Мікола, Георгій Пераможца – нябёснае войска, на якое спадзяваўся беларускі народ у цяжкія часы выпрабаванняў. Да абразоў, што прадстаўлены на выставе, больш за сотню гадоў звярталіся з самымі патаемнымі думкамі і просьбамі нашы продкі. Асаблівасць праекта ў тым, што экспануюцца і ліштвы – мастацкі элемент вонкавага аздаблення сялянскай хаты. Яны былі перавезены з вёскі Кудрычы Пінскага раёна, якая славіцца наяўнасцю яшчэ саламяных стрэхаў на хатах. Можна сцвярджаць, што абразы і ліштвы – уратаваная спадчына. Многія з твораў знаходзіліся ў кепскім стане, аднак праведзеныя ратавальныя мерапрыемствы дазволілі паказаць прыгажосць беларускага мастацтва.

Выстава дзейнічае па 30 красавіка.







*Скарыстаная інфармацыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, Ружанскага палацавага комплексу роду Сапегаў.*

*Будзем памятаць мы...*

# Эпоха Аляксея Пяткевіча

## Слова на развітанне

***11 сакавіка ў Гародні памёр Аляксей Пяткевіч... Балючая вестка... Горад над Нёманам у гэтыя дні зноў асірацеў на адну вялікую асобу. У 1992 г. тут завяршылася эпоха Аляксея Карпюка і Міхася Ткачова, у 2017 г. – Ігара Жука, у 2020 г. – Юркі Голуба... За імі следам – эпоха Аляксея Пяткевіча. Пісьменніка. Педагога. Прафесара. Як жа без яго будзе Гародня і яе творчая інтэлігенцыя?.. Мы ж яго любілі, слухалі, шанавалі, бралі прыклад, вучыліся ў яго тактоўнасці, дабру, шчырасці, спакою, адданасці сваёй Бацькаўшчыне і, вядома ж, творчасці. І ён нас любіў бязмежна, як любіць бацька і дзед сваіх дзяцей і ўнукаў.***

Побач з Аляксеем Міхайлавічам мы адчувалі сябе добра, самавіта, мужна, смела. Нават не верыцца, што яго ўжо няма. Што ён не паедзе з намі ў вандроўку па родным краі, не выступіць на Гарадзенскім абласным свяце паэзіі ў Зачэпічах на Дзятлаўшчыне, што мы не абмяркуем з ім свежы выпуск альманаха «Новы замак», што ніколі ў жыцці не атрымаю ад яго лісты, бандэролі, тэлефонныя званкі?.. Няўжо ён ніколі не дашле мне штогадовы Гарадзенскі настольны краязнаўчы перакідны каляндар, які ён рыхтаваў і выпускаў разам са Станіславам Суднікам з 2010 года?.. Гэта проста невычэрпныя боль і жаль. Асобаў такога маштабу лёс дорыць кожнай нацыі надзвычай рэдка. Не прачытаем мы новых кніжак Аляксея Міхайлавіча, не пачуем яго цікавых выступленняў і меркаванняў на розных сустрэчах і прэзентацыях. Каранавірус забраў нашага таленавітага земляка, пісьменніка, вучонага...

Нарадзіўся Аляксей Пяткевіч 30 сакавіка ў 1931 г. у вёсцы Новы Свержань на Стаўбцоўшчыне. Скончыў аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ (1954) і аспірантуру БДУ (1957). Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Псіхалагічны аналіз і праблема характару ў прозе Кузьмы Чорнага».






*Аляксей Пяткевіч (1971 г.)*

У Гародні пісьменнік жыў з 1957 г. Быў адным з ініцыятараў і актыўным змагаром за наданне Гарадзенскаму ўніверсітэту імя класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, стварэння кафедры беларускай культуры. Выступаў у друку як крытык і літаратуразнаўца з 1958 г.

У Саюз пісьменнікаў, як успамінаў сам Аляксей Міхайлавіч, яго «ўпіхнуў» Васіль Быкаў у 1971 г. На прыёмнай камісіі Іван Мележ па праве старшыні задаў яму пытанне паўжартам: «Ну што, Аляксей Міхайлавіч, як вы дайшлі да такога жыцця?». Аляксей Пяткевіч неяк спалохана адказаў: «Я не вінаваты, гэта ўсё Васіль Быкаў». І сапраўды было так. Аднойчы Васіль Уладзіміравіч папрасіў Аляксея Міхайлавіча скласці спіс сваіх літаратуразнаўчых публікацый. Той не надаў асаблівай увагі гэтаму, але спіс склаў. У ім было каля 30-і назваў артыкулаў і рэцэнзій. Васіль Быкаў напісаў Аляксею Пяткевічу рэкамендацыю для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў. А потым параіў Дануце Бічэль зрабіць тое ж самае. І вось у 1971 г. Аляксей Пяткевіч стаў сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 1968 г. у Мінску выйшаў зборнік артыкулаў і нарысаў «Наднёманскія былі», суаўтарам якога быў і Аляксей Пяткевіч. Кніга адкрывалася яго артыкулам «Сцежкамі роднага краю». На 92-х старонках аўтар распавёў пра літаратурную Гарадзеншчыну. У 1981 г. была выдадзена першая кніга даследчыка «Сюжэт. Кампазіцыя. Характар: Аб прозе Кузьмы Чорнага». Аляксей Пяткевіч прыняў удзел у напісанні «Гісторыі беларускай літаратуры. ХІХ – пачатак ХХ ст.» (Мінск, 1981) і іншых калектыўных выданняў. З-пад яго пяра выходзяць цікавыя і карысныя кнігі «Людзі культуры з Гродзеншчыны» (2000), «Старонкі спадчыны. Культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы» (2006), «Слова і кніга Прынёмання» (2016), «Аўтографы – разам» (2018), «Водгулле з маёй дарогі» (2021) і іншыя.

Аляксей Міхайлавіч шмат увагі надаваў і грамадскай дзейнасці: быў старшынём Гарадзенскай рады Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, сябрам Рэспубліканскай рады ТБМ, Рэспубліканскага навуковага савета «Народная творчасць і быт беларусаў», Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Міжнароднага фонду Янкі Купалы, старшынём Гарадзенскай гарадской суполкі «Ветэраны Адраджэння»...

Вельмі любіў Аляксей Пяткевіч свой родны Новы Свержань на Стаўбцоўшчыне, які ён называў мястэчкам. Тым больш, што гэты статус быў нададзены яму ў 1568 г. Сёння ж гэта буйное паселішча – 15 вуліц, каля дзвюх тысяч жыхароў. Для пісьменніка гэта была найдаражэйшая ў свеце мясціна. Адсюль з'ехаў ён на вучобу ў Мінск. У маладосці наведваўся ў Новы Свержань часта, то адзін, то з сям'ёй. Асабліва, калі жывыя былі бацькі. У апошнія гады – радзей: адзін-два разы на год. Адзін раз – абавязкова, бо збіраліся, папярэдне дамовіўшыся, звычайна ў жніўні, у бацькоўскай хаце ўсе блізкія і далёкія родзічы з малымі дзецьмі. Вытрымліваючы рытуал, садзіліся за стол. Затым ішлі на Нёман, які тут зусім блізка, пасля – на могілкі. Заўсёды трымаў сувязі з землякамі, тэлефанаваў ім. І яны таксама трымалі з ім сувязь. Стараўся сачыць за жыццём роднага мястэчка. У стаўбцоўскую раённую газету «Прамень» пісаў пра гісторыю Свержаня, пра яго надзённыя праблемы. Чым далей каціліся гады, тым мацней клікала да сябе яго дарагая мясціна, шчыміла туга па ёй. Але была ў гэтай тузе і высокая светлая нота далучанасці да роду, да зямлі маленства. Таму вельмі часта ў апошнія гады вяртаўся «дадому», бачыў сваю хату з двума вокнамі на фасадзе, высокай вішняй у палісадніку, рэчачку перад хатай і магутны топаль на супрацьлеглым беразе. Чуў скрып веснічак, што вядуць у двор, і галасы дзяцей – унукаў сваёй пляменніцы, якая жыве з сям'ёй у гэтай хаце.

У Аляксея Міхайлавіча было шмат сяброў. Многія з іх адышлі ўжо ў лепшы свет. Сярод сяброў былі Мікола Мельнікаў з Гародні і Алесь Белакоз з Мастоўшчыны. З Алесем Белакозам – чалавекам беларускай ідэі, настаўнікам, краязнаўцам – сябраваў даўно. Яго ведалі як стваральніка ўнікальнага дзяржаўнага музея ў вёсцы Гудзевічы на Мастоўшчыне. Ён выпакутаваў гэты музей цаной усяго жыцця і здароўя. Выстаяў, праявіўшы сапраўдную сілу духу. Стараўся Аляксей Пяткевіч яму дапамагаць з самага пачатку яго барацьбы з ідэалагічнымі «апекунамі», але больш падтрымліваў маральна. Усё ж жылі на адлегласці. Праўда, сустрэчы ў маладыя гады былі частымі. А потым часцей – тэлефанаванне, паштоўкі.

У Гародні найбліжэйшым яму чалавекам і сябрам быў Ігар Жук, доктар філалогіі, таленавіты беларускі літаратуразнаўца, інтэлектуал. Яны добра і лёгка разумеліся. І душы іх знаходзіліся, здаецца, на нейкай адной хвалі. Было нямала іншых выдатных асоб у жыцці Аляксея Пяткевіча, найперш гэта Адам Мальдзіс і Арсень Ліс...

У жыцці Аляксея Пяткевіча найбольш хвалявала рэзкае выцясненне з афіцыйнага ўжытку беларускай мовы, масіраваная русіфікацыя Беларусі і, адпаведна, звужэнне жыццядзейнасці нацыянальнай культуры. Страты беларускасці хвалявалі яго тым больш, што праз усё сваё жыццё выкладчыка ўніверсітэта ён стараўся выхоўваць у студэнтаў нацыянальную свядомасць, пачуццё роднага, без чаго не можа скласціся духоўна паўнацэнны чалавек. Аляксей Міхайлавіч лічыў, што трэба вяртаць велізарную духоўную спадчыну краю нашым сучаснікам, адраджаць яе. У прыватнасці, яго трывожыла праблема ўшанавання вялікіх асобаў Гарадзеншчыны: у назвах вуліц, у адкрыцці помнікаў і мемарыяльных дошак...

Пра Аляксея Міхайлавіча можна пісаць і разважаць бясконца. Я вельмі спадзяюся і веру, што з цягам часу значэнне асобы Аляксея Пяткевіча будзе толькі большаць. І хоць завяршылася эпоха нашага таленавітага літаратуразнаўца, але справы яго, задумы і мары засталіся з намі.

*Сяргей ЧЫГРЫН*

*Фотаздымкі з архіва аўтара*



*З дачкой Марынай, жонкай Марыяй у роднай вёсцы Новы Свержань на Стаўбцоўшчыне. Лета 1984 г.*



*Юрка Голуб, Аляксей Пяткевіч, Ігар Жук (2011 г.)*



*Зоська Верас, Аляксей Пяткевіч і Генадзь Кахадоўскі ў Вільні (1982 г.)*

# Наўзбоч дарог яго жыцця

*21 сакавіка найстарэйшы пісьменнік Магілёўскага краю Віктар Арцем'еў адзначае свой 95-гадовы юбілей.*

Нарадзіўся Віктар Іванавіч у 1927 г. у Шклоўскім раёне на хутары Чарэйцаў Круг, які месціўся ў маляўнічым кутку за кіламетр ад вёскі Радзішына. Родныя мясціны натхнілі яго на стварэнне краязнаўчых зборнічкаў «Чарэйцаў Круг», «Радзішына», «Цячэ рэчка Бася», «Шчодрасць душы».

Сям'я была вялікая: бацька Іван Лукіч, маці Маўра Мітрафанаўна, бабуля Хадора, сёстры Надзея, Марыя, Роза і браты Леанід і Анатоль. Дзіцячыя гады запомніліся спевамі жаўрукоў і посвістам шпакоў, прывабнымі малюнкамі прыроды, а зімовымі вечарамі Віктар зачаравана слухаў ад старэйшых бывальцы, казкі і народныя песні. Самым любым заняткам стала чытанне кніг. Вельмі ўдзячны Віктар Іванавіч сваім першым настаўнікам Вользе і Фёдару Лук'янавым (дарэчы, летась на ўласныя сродкі ён устанавіў новы помнік сваёй першай настаўніцы). Яны клікалі да сябе і прапаноўвалі кнігі з сямейнай бібліятэкі. Першай кнігай была аповесць Якуба Коласа «Дрыгва».

Бацька Іван Лукіч рана прывучыў Віктара да сялянскай працы: у пяць гадоў пасвіў карову, а ў шэсць на пары ціхмяных коней баранаваў загон. Падлеткам у час школьных канікулаў працаваў у калгасе.

У вайну бацька служыў пад Масквой у 810-м працоўна-будаўнічым батальёне, куды пайшоў добраахвотнікам. Уся мужчынская праца лягла на плечы чатырнаццацігадовага Віктара. Ён стаў сведкам цяжкага адступлення ў 1941 г., на свае вочы бачыў палонных чырвонаармейцаў, здзекі акупантаў і паліцаеў, знішчэнне яўрэйскага насельніцтва, прымусовае перасяленне, голад, страты родных і аднавяскоўцаў. Таму самым галоўным святам на ўсё жыццё для яго стаў Дзень Перамогі.

Пасля вайны бацька ўзначаліў калгас на Шклоўшчыне, у 1949 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Віктар паважаў бацьку, прыслухоўваўся да яго меркавання, але для сябе выбраў іншую дарогу.

У 1946 г. паступіў на бібліятэчнае аддзяленне Магілёўскага культасветвучылішча. Вучыўся старанна. Пасля заканчэння вучобы ў 1948 г. быў накіраваны загадчыкам Парыцкай



Віктар Арцем'еў

раённай бібліятэкі Бабруйскай вобласці. Да 1969 г. працаваў ва ўстановах культуры на розных пасадах. Калі ў якасці метадыста наведваўся ў бібліятэкі, звяртаўся да супрацоўнікаў: «Гаварыце мне толькі пра добрыя справы, а недахопы я сам знайду». Ён заўсёды адзначаў становучае ў рабоце, выкрываў недахопы і абавязкова прапаноўваў шляхі паляпшэння становішча.

З 1969 па 1987 г. працаваў выкладчыкам Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума імя А.С. Пушкіна. За амаль дваццаць гадоў выхаваў не адно пакаленне спецыялістаў бібліятэчнай справы, са многімі з якіх да гэтай пары падтрымлівае стасункі.

Прыступкай да пісьменніцкай дзейнасці стала напісанне нататак і артыкулаў для школьнай насценнай газеты. З тае пары ў сямігодцы і ў вучылішчы рабіў насценныя газеты, а са жніўня 1948 г. і на ўсё жыццё стаў актыўным няштатным журналістам мясцовых і рэспубліканскіх друкаваных выданняў.

З канца 1970-х гг. Віктар Іванавіч працаваў карэспандэнтам-арганізатарам Саюза пісьменнікаў БССР. З удзелам Аляксея Пысіна, які на той час узначальваў абласную пісьменніцкую арганізацыю, ладзіў літаратурныя сустрэчы. Гэта паспрыяла знаёмству з выдатнымі пісьменнікамі: Іванам Чыгрынавым, Віктарам Карамазавым, Раісай Баравіковай, Нілам Гілевічам, Яўгеніяй Янішчыц, Міколам Маляўкам ды многімі іншымі. Ён слухаў на сваім вяку выступленні Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Пятра Броўкі, Сяргея Грахоўскага, Канстанціна Сіманава, Яўгенія Далматоўскага, Рымы Казаковай. Некалькі гадоў ліставаўся з Янкам Брылём. З Іванам Шамякіным, якога Віктар Іванавіч лічыць адным з самых моцных празаікаў, адбылося некалькі сустрэч. Арганізацыя сустрэч з пісьменнікамі з'явілася для В. Арцем'ева універсітэтам прыгожага беларускага пісьменства, на занятках якога адбывалася ўзаемаабагачэнне творчымі стасункамі і ідэямі.

Віктар Іванавіч з'яўляецца галоўным біёграфам, даследчыкам і прапагандыстам літаратурнай спадчыны А. Пысіна. Знаёмства з ім перарасло ў моцнае сяброўства, якое доўжылася чвэрць стагоддзя. В. Арцем'еў праводзіць вялікую работу па папулярызацыі творчасці А. Пысіна. Спачатку пісаў і змяшчаў артыкулы ў рэспубліканскім і абласным друку, затым выдаў зборнікі «Вянок Аляксею Пысіну», «Пысіны: ад прадзеда да праўнукаў», «Урокі Аляксея Пысіна: гісторыі



Віктар Арцем'еў і Аляксей Пысін. Жнівень 1958 г.

вершаў, нарысы», «Мая пысініяна», «Бібліятэка паэта Аляксея Пысіна». У 2020 г., да 100-годдзя паэта, выдаў галоўную кнігу «Народны душою…». З мэтай захавання памяці і папулярызацыі творчасці А. Пысіна Магілёўскай абласной бібліятэкай з 2010 г. ладзяцца Пысінскія чытанні. Віктар Іванавіч прымае ў іх актыўны ўдзел і кожны год прэзентуе сваю кнігу. Да Пысінскіх чытанняў 2022 г. падрыхтаваў новае выданне аб жыцці і творчасці пісьменніка «Як промні вечнасці радкі».

Арцем'еў даследаваў і творчасць паэта-аднавяскоўца Анатоля Сербантовіча, а выдатнаму паэту Івану Пехцераву, з якім сябраваў доўгія гады, прысвяціў кнігу «Пясняр зямлі магілёўскай». Галоўнай кнігай свайго жыцця Віктар Іванавіч лічыць зборнік «Пісьменнікі і кнігі». У ім змешчаны ўспаміны пра вядомых беларускіх пісьменнікаў. Гэты зборнік – ладны пласт летапісу літаратурнага краязнаўства, культурнай і гістарычнай спадчыны Магілёўшчыны.

Адным з накірункаў літаратурнай дзейнасці Віктара Іванавіча з'яўляецца вершаскладанне. Паэтам сябе не лічыць, але захапленне лірычным словам пранёс праз усё жыццё. Віктар Іванавіч стаяў каля вытокаў стварэння літаратурнага аб'яднання «Ветэран» пры Магілёўскім гарадскім Савеце ветэранаў, доўгі час быў яго актыўным удзельнікам, шчыраваў намеснікам старшыні аб'яднання і галоўным рэдактарам некалькіх літаратурных зборнікаў.

Набалелай для Арцем'ева-пісьменніка з'яўляецца моўная праблема. Ён лічыць, што родная мова – наймацнейшы падмурак нацыянальнай культуры, але ў цяперашні час знаходзіцца ў заняпадзе. Эсэ, абразкі і слоўнік дыялектаў вёсак Ордаць і Радзішына выклаў на старонках невялікага зборніка «Слоўцы-адмыслоўцы». Віктар Іванавіч цвёрда перакананы, што беларус – той, хто гаворыць па-беларуску.

У чым жа сакрэт даўгалецця і творчай актыўнасці Віктара Іванавіча? Адказ у яго інтэрв'ю 2017 г., дзе ён расказаў пра свае захапленні, што дапамагаюць яму ў жыцці:

*«Яшчэ мне люба бачыць свет, падарожнічаць. Я аб'ехаў, а дзе і пешшу прайшоў, зямлю магілёўскую ўздоўж і ўпоперак. Бачыў наваколле, былі сустрэчы і гамонкі з цікавымі людзьмі і тое запала ў памяць.*

*Люблю даглядаць кветкі. Яны ў мяне на падаконніках на кухні і ў пакоі, а летам яшчэ і на балконе. Некалькі гадоў таму асвоіў падаконнік у пад'ездзе.*

*Люблю слухаць музыку, песні – класіку і народныя. Сабраў па некалькі соцень аўдыякасет і дыскаў.*

*Фатаграфія – яшчэ адно захапленне ў жыцці. Люблю рабіць фотаздымкі: людзей, а яшчэ больш пейзажы. Люблю рэчку, возера, луг у квецені, лес у любую пару года, прастор палёў, асабліва ў жніво…*

*Штогод збіраю больш двух дзясяткаў найменняў траў, ведаю карысць і шкоду кожнай, раблю вітамінныя і лячэбныя адвары, спірта-гарэлачныя настоі…».*




Віктар Іванавіч – чалавек прагрэсіўны, адкрыты для ўсяго новага. У такім паважаным узросце ён асвоіў камп'ютар, карыстаецца электроннай поштай і інтэрнэтам. Усе тэксты яго твораў набраны ўласнаручна, а гэтым не могуць пахваліцца і маладзейшыя за яго калегі па пяры. Формула поспеху – упартая да поту праца. І ўпэўненасць, што робіць нешта, хаця і невялікае, але патрэбнае для людзей.

У 2008 г. В. Арцем'ева прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Творчыя поспехі і яго грамадская праца атрымалі высокую адзнаку: ён – лаўрэат прэміі імя Якуба Усікава Магілёўскага абласнога аддзялення СПБ. У 1967 г. імя В. Арцем'ева занесена ў Кнігу Гонару ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама. Мае нагрудныя знакі «За выдатную працу» Міністэрства культуры СССР, «Ганаровы ветэран Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў», «За высокі ўклад у літаратуру» СПБ, некалькі юбілейных медалёў і дзясяткі Ганаровых грамат.

Жыццё і творчая дзейнасць В. Арцем'ева знайшлі адлюстраванне ў біябібліяграфічным паказальніку Магілёўскай абласной бібліятэкі «Тры нівы Віктара Іванавіча Арцем'ева», які ўключае каля тысячы запісаў. Паказальнік рэгулярна абнаўляецца, дапаўняецца новымі запісамі і прадстаўлены на сайце бібліятэкі, што робіць яго даступным для кожнага.

***Напрыканцы прывядзем словы Віктара Іванавіча, што гучаць як наказ маладым на далейшае жыццё: «Паверце, калі нечым займаецца з захапленнем, то жыццё становіцца цікавым, змястоўным, лепшым і даўжэйшым. Любіце сваіх бацькоў, родных, малую радзіму, матчыну мову і Айчыну. Будзьце патрыётамі сваёй краіны!..».***

*Галіна ДЗЯТЛАВА,*
*галоўны бібліятэкар*
*Магілёўскай абласной бібліятэкі*

# «Венскі вальс»

Менавіта з назваю твора нашага знакамітага кампазітара Ігара Лучанка (афіцыйна песня называецца «Майскі вальс». – **Рэд.**) у мяне ўзнікаюць асацыяцыі, калі ўсплываюць успаміны аб паваенным дзяцінстве. Звязаны яны з першым у маім жыцці музычным інструментам, які тата ў 1945 г. прывёз у якасці трафея з Германіі. Гэта быў гармонік з так званым «венскім ладам». Справа ў тым, што вясковыя музыкі звычайна карысталіся гармонікамі, якія ў нас называліся «хромкамі», – так званы «рускі лад». Яны выраблялiся ў Расіі, а пасля вайны і ў нашым Маладзечне. Аднак не ўсе гарманісты, якія карысталіся «хромкамі» (звычайна самавукі), маглі адразу прызвычаіцца да «венкі». Замінала асаблівасць яе галасавога механізма.



*Фэст у вёсцы Вострава (11 верасня 1947 г.)*

Так і праляжала трафейная «венка» ў майго дзеда Пракопа ў хаце да таго часу, як у нас у Востраве з'явіўся ў 1947 г., пасля дэмабілізацыі, хлопец Саша Жыварчэня – мабыць, прымак, бо прозвішча такога ў астраўцоў не было ні да, ні пасля вайны.

У маёй асацыяцыі да «Венскага вальса» і па сённяшні імя Сашы Жыварчэні звязваецца з тым салдатам з песні І. Лучанка і М. Ясеня, які «рэзаў» вальс на плошчы Вены. Канечне ж, яго чулі «і Альпы, і Дунай». Толькі я перакананы: гэта быў наш вальс – «Залатыя горы». Ды які яшчэ вальс мог граць Саша Жыварчэня – салдат-пераможца на прыступках знакамітай Венскай оперы? Канечне ж, пра «залатыя горы і рэкі поўныя віна...». Маім першым «музычным творам» на «венскім» гармоніку, дзякуючы настаўніцтву Сашы Жыварчэні, стаў менавіта вальс «Залатыя горы».

Шаноўныя чытачы! Не думайце, што я хачу расказаць пра тое, як вучыўся граць на гармоніку. Гэта быў толькі ўступ да тэмы – пра асноўнае і самае вялікае свята, што адзначалася ў нашай вёсцы кожны год 11 верасня, свята Аляксандра Неўскага. Памяць таксама зафіксавала такія ж рэлігійныя (па назве) святы некаторых блізкіх да нашай вёскі паселішчаў: у Домантавічах – Успення, у Піліпавічах – Ушэсця (прыводжу іх у тагачасным нашым вымаўленні). Як «жывому дакументу эпохі», застаецца засведчыць, што гэтыя святы на канец 1940 – пачатак 1950-х гг. былі самымі значнымі фэстамі (так яны і называліся) у беларускіх вёсках. Былі, канечне, і іншыя святы. Пра іх нагадвала ўлада ўрачыстымі сходамі і рэдкімі агітатарамі (святла, радыё, газет у нас не было да сярэдзіны 1950-х). Так ужо павялося, што Першамай, Кастрычнік (у нашым вымаўленні) – гэта святы ўлады і іх трэба адзначаць урачыста. А ўрачыста – гэта не па-сямейнаму, гэта з плясканнем у далоні і, безумоўна, цвяроза. З выпіўкаю адзначаўся, мабыць, толькі Дзень перамогі (на маёй памяці – самае прыгожае савецкае свята). У гэты дзень дзед Пракоп, пускаючы чарку, не мінаў і мяне. Наліваў пару кропель самагону, тым самым быццам бы далучаў і свайго ўнука да тых, хто «каваў Перамогу» (так казалі ў тыя гады).

Асабліва ж запомніўся фэст Аляксандра Неўскага. Пачатак верасня, ураджай сабраны, больш вольнага часу ў хлебаробаў. У хаце стол, зроблены з дошак і падобны да літары «П». Ён пакрыты чыстымі белымі абрусамі ці саматканым палатном і застаўлены ежаю так, што вольнага месца не відаць. На двары вазы гасцей стаяць у два рады, а каму не хапіла месца – у агародзе. Усе яны прыбраныя саматканымі посцілкамі. Тут жа стаяць упрыгожаныя жывымі крачкамі коні. Гаспадар хаты, прымаючы гасцей, павінен накарміць і іх коней. Таму ў кожнага каня на шыі вісіць торба з аўсом і побач ляжыць добры абярэмак сена. Ды не абы-якога – лугавога.

Усе госці за сталом рассаджаны па нейкім, аднаму гаспадару вядомым, парадку, абавязкова сямейнымі парамі, малыя дзеці на каленях у мамак. Пачынаючы застолле, гаспадар налівае дзве чаркі (сабе і жонцы), абавязкова кажа прывітальнае слова, у якім дзякуе гасцям за прыезд «здалёк і зблізку». Затым «пускае чарку» па коле. Там, дзе чаркі не было, яе замянялі гранёнай шклянкай. Калі кола замкнулася, пачыналася бяседа. Яна звычайна цякла павольна, спакойна. І тэмы яе былі знаёмыя, сялянскія. Абменьваліся навінамі з гасцямі з далёкіх і блізкіх вёсак (калі яшчэ давядзецца сустрэцца!?). Дарэчы, за сталом ніхто і ніколі не згадваў Аляксандра Неўскага. Ды і мала хто з астраўцоў ведаў гэтую асобу, заангажаваную царквой для маёй вёскі ў якасці святога. Але дзякуючы гэтаму святу людзі збіраліся, сустракаліся, абменьваліся навінамі.

Кульмінацыяй свята былі танцы. Тут і Саша Жыварчэня, і мая «венка» рабілі цуд, які можна адчуць, паглядзеўшы на здымак, што захаваўся ў мяне з фэсту 11 верасня 1947 г. Толькі, на жаль, якасць яго адпавядае году, калі ён зроблены. Усе госці і жыхары вёскі Вострава спяшаліся да месца, адкуль гучала музыка: гармонік і самаробны барабан. Гэта плошча на ўскрайку вёскі, каля нашай хаты, прыняла ўсіх – і гасцей, і астраўцоў. Па ценях на здымку відаць, што ён зроблены ўжо на захадзе сонца. А гулянні працягваліся да позняй ночы і заканчваліся звычайна бойкамі паміж хлопцамі. Прычына гэтых боек адна – п'янства, а нагода – старэлая нядобразычлівасць паміж асобнымі вёскамі, што межавалі адна з адной. Мяжа заўсёды была месцам спрэчак, боек, войнаў, як паміж людзьмі, так і паміж дзяржавамі. Тысячагоддзі гэта было. Актуальна, як бачым, і сёння.

У сярэдзіне 1950-х гг. савецкая ўлада стала забараняць правядзенне фэстаў у вёсках Капыльскага раёна (відаць, гэта адбывалася па ўсёй Беларусі). Распаўсюджваліся чуткі пра забойствы людзей пад час такіх гулянак. Людзі казалі, што і царква падтрымала намаганні ўлады. Народ жа вясковы, як заўсёды, знайшоў выхад: пачаў гнаць самагон да савецкіх святаў, якія раней адзначаліся толькі ўрачыста. Пілі і на Май, пілі і на Кастрычнік, на 8 сакавіка і нават на дзень Сталінскай канстытуцыі. Перасталі піць на свята Аляксандра Неўскага, бо нічога ўжо не звязвала астраўцоў з ім. Яно знікла з памяці маіх аднавяскоўцаў, мабыць, і таму, што прывязанае было штучна, без замацавання гісторыяй.

*Уладзімір ГІЛЕП*

# Святы ліплянцаў

Традыцыі святкаванняў у вёсцы Ліпляны Лельчыцкага раёна маюць старажытныя карані і ўбіраюць у сябе некалькі вялікіх культурных напластаванняў. Гэта сімбіёз дахрысціянскага, хрысціянскага і савецкага. Два асноўныя святы, якія называюць ліплянцы, – Правадная Нядзеля (першая нядзеля пасля Вялікадня) і Успенне Найсвяцейшай Багародзіцы (па-мясцоваму Спенне, Спленне, Успленне), што адзначаецца 28-га жніўня. Вось згадкі пра святкаванне Успення да вайны:

*Прыязджалі і горшкі прывозілі. Прадавалі. Эта на Спленне. Яблоко, грушы продавалі. Падводамі прыязджалі, да продавалі тутака. Кагда малая была. На Спленне богато людзей. Ужо ж цэркавь была закрыта. Ужо цэркві не было, но ўсё раўно прыязджалі сюды. (Клаўдзія Лось.)*

У другой палове XX ст. вяскоўцы па-ранейшаму лічылі, што працаваць у святочны дзень нельга, хаця ў калгас хадзіць даводзілася. На святы гатавалі шмат страў, запрашалі родных з усяго раёна, «круцілі» музыку, ладзілі танцы. Адмыслова да іх гналі самагон. Не абыходзілася і без камічных выпадкаў.

*На Успенне прыходзілі з розных вёсак у госці на шырокае застолле. Адны прыходзілі... Потым іншыя прыходзілі... Так працягвался дні два-тры гэта святкаванне. Былі такія людзі, якія для таго, каб некалькі дзён хадзіць, нешта недзе забывалі. І вось быў такі дзядзька, яго звалі Іван Дзягцяр. Ён сам з Лельчыц быў. Прыходзіў у першы дзень, праходзіў некалькі гасцей. Потым ішоў дадому і абавязкова што-небудзь забываўся. Назаўтра прыходзіў: «Я ў вас шапку забыўся... Не ў цябе забыўся?» Ізноў яго частуюць, і ён ідзе далей шукаць сваю шапку... (Георгій Казачэнка.)*

Згадваецца і пэўнае супрацьстаянне мясцовых традыцый з савецкімі. Найбольш гэта адчувалася ў сем'ях камсамольцаў, камуністаў, настаўнікаў і савецкіх кіраўнікоў.

*Бацькі хадзілі постоянно ў царкву. Я лічно не хадзіў... Член парціі да ў цэркву тагда?! Тогда ж ікона ў мяне ў хаці вісела. То прыйшоў раз начальнік да ўвідзеў, то вызывалі ў райком. «Чо ікона ў хаці?» Ну, я праўда отговорыўся. Говору: «Як я выкіну ікону, еслі ў мяне цёшча жывє?» Воні сказалі: «Не надо, раз цёшча жывє». Але яна то калі жыла, калі не жыла. Но ікона моя була, не яе. Яна і зара там у хаце. (Іван Лось.)*

Цікавыя спробы вяскоўцаў адаптаваць савецкія святы да традыцыйных уяўленняў і гадавога земляробчага кола.

*На 1 мая калгасныя коні былі вольныя, і людзі ў сябе на прысядзібным участку садзілі бульбу. (Уладзімір Паўлечка.)*

*Кастрычніцкую адзначалі. Збіраліся. Ужо калгас сабраў ураджай і на Кастрычніцкую ладзіліся дажынкі! У нас у хаце было. Тата брыгадзірам быў, то прыходзілі: аграном [і іншыя]... І ўжо вячэра ў іх. Яны і па сто грам выпівалі. Сабралі ўраджай, але прыраўноўвалі яго да Кастрычніцкай, таму што ў будні дні гуляць не было часу. (Лідзія Мешчанка.)*

З традыцыйнай абрадавай культуры ліплянцы найбольш згадваюць вяселле, пачынаючы ад сватання і да трэцяга дня свята, які тут называўся «пеўні». Асаблівасцю абраду было ўпрыгожванне ялінкі ў хаце нявесты. Ёсць згадкі і пра іншыя традыцыі: праверку цнатлівасці маладых, якіх ставілі на дзяжу яшчэ ў 1960-я гг., ацэньванне багацця нявесты вяскоўцамі і інш.

*Я шла замуж у 1960-м году. Тыя годы позбіраюцца, да колькі ручнікоў прывезла, да павесяць. Пашчытаюць тыя побочны, хто прыйдзе глядзець. Да колькі просцілок повесіў. Усе пашчытаюць, не так, як сягодні. Тая, што возьме, нашчытае, скажа багата: «Богата прывезла». (Вольга Барысаўна Сечка.)*

*Вольга ІВАНОВА*



*Вясковае свята. Ліплянскія музыкі (1960-я гг.)*

*Як я стаў патрыётам-краязнаўцам*

# З гісторыі маёй сям'і

***Добрую рубрыку «Як я стаў патрыётам-краязнаўцам» адкрыла на сваіх старонках «Краязнаўчая газета». Сапраўды цікава, як кожны з нас стаў краязнаўцам. У маім выпадку на гэта найперш паўплывалі расповеды маіх родных пра гісторыю нашай сям'і. Гісторыю адной з соцень тысяч беларускіх сямей, пра якія не напісана ў кнігах, але якая дае магчымасць убачыць гістарычныя падзеі вачыма іх сведкі, простага чалавека. Я доўга хацеў напісаць свае ўспаміны і зараз з задавальненнем гэта раблю.***

Маё дзяцінства было складаным, бо, калі мне было каля чатырох гадоў, мае бацькі разышліся, раз'ехаліся ў розныя бакі, і маці пакінула мяне ў бабулі, якая тады працавала ў Мсціслаўскай раённай бібліятэцы. Яна даволі часта брала мяне на працу, таму я гадаваўся сярод кніг, часопісаў і газет. Рана, яшчэ да школы, я навучыўся чытаць, першую сваю кніжку «Тры мушкецёры» Аляксандра Дзюма я адолеў за некалькі месяцаў і потым доўга распытваў у бабулі пра падзеі ў Францыі ў XVII ст.

Паколькі бабуля займалася працай і гаспадаркай, мяне даглядала яе маці, мая прабабуля Марыя Кузьмінічна Драздоўская, якая пражыла сто гадоў і памерла ў 1982 г. Яна скончыла на выдатна царкоўна-прыходскую школу і вельмі хацела вучыцца далей, у гімназіі, але бацька адмовіўся плаціць за яе навучанне, бо лічыў, што жанчына павінна гадаваць дзяцей і адукацыя ёй не патрэбна. Нават у сталыя гады яна вельмі шкадавала, што не змагла вучыцца далей і мусіла выйсці замуж за «старога кавалера», які паходзіў з дробнай мсціслаўскай шляхты, – Міхаіла Радзівонавіча Драздоўскага. У свой час ён скончыў адпаведную вучэльню ў Горках і стаў прафесійным будаўніком, працаваў на будоўлях Мсціслаўшчыны «кіраўніком будаўнікоў» (па-сённяшняму прарабам).

У зімовыя вечары, калі за вокнамі выла завіруха, а ў хаце было холадна, я сядзеў на цёплай печы, накрыты старым кажухом, які некалі насіў яшчэ мой прадзед, і слухаў расповеды прабабулі пра жыццё Мсціслава і нашай сям'і. Прабабка нарадзілася ў 1882 г. і памятала шмат. Яна распавядала, як з навакольных мсціслаўскіх вёсак у горад звезлі «рэкрутаў» на руска-японскую вайну, і яны практычна захапілі ўладу ў горадзе: пілі гарэлку, разагналі паліцыю. Толькі прысланыя казакі здолелі іх уціхамірыць. Далей ішлі аповеды пра першую рускую рэвалюцыю, 1917 год, стварэнне ў Мсціславе камуны, куды бальшавікі забралі нашу скаціну і прымушалі прабабку працаваць за паўлітра малака ў дзень для яе малых дзяцей. Гэтыя аповеды, якія прабабка паўтарала не адзін раз з цікавымі дэталямі і дапаўненнямі, я і зараз добра памятаю і часам пераказваю сваёй дарослай унучцы, якая таксама любіць гісторыю і добра яе ведае.

Калі я пайшоў у школу, гісторыю СССР (і крыху на факультатыўных занятках – гісторыю БССР) нам выкладаў былы франтавік, які меў узнагароды (сярод якіх быў і медаль «За адвагу») Юрый Захаравіч Нікіцін. Пра вайну ён успамінаць не любіў, але мог расказаць пра нейкі эпізод, калі мы яго вельмі прасілі.

Звычайна летам, на канікулах, я з задавальненнем прачытваў падручнікі па гісторыі, якія нам выдавалі напярэдадні першага верасня, і ў мяне ўзнікалі шмат якія пытанні па гісторыі Беларусі. Тады я ішоў да малодшага брата маёй прабабулі Дзмітрыя Палеўскага, які вельмі мяне любіў. Ён таксама шмат пабачыў у сваім жыцці, пражыў 88 гадоў. У 16 гадоў ён падлеткам паехаў у Санкт-Пецярбург, там уладкаваўся на славуты Пуцілаўскі завод, дзе зрабіў кар'еру ад падмятальшчыка смецця ў цэхах да слесара вышэйшай катэгорыі і належаў да рабочай арыстакратыі. У войска ў 1914 г. яго не ўзялі, бо працаваў на ваенным заводзе, і на свае вочы бачыў спачатку расійскага імператара Мікалая II, які прыязджаў на Пуцілаўскі завод і падараваў самым лепшым рабочым па залатой манеце са сваім профілем, а потым у часы рэвалюцый (Лютаўскай і Кастрычніцкай) – Уладзіміра Леніна і Льва Троцкага, нават размаўляў з імі. У 1917 г. ён уступіў у Чырвоную гвардыю і ўдзельнічаў у ліквідацыі «Карнілаўскага мяцяжу».



Дзед Міця з жонкай і дачкой

Аднак у 1918 г. у яго забралі вялікую кватэру на Неўскім праспекце, якую ператварылі ў камуналку, пакінуўшы яму маленькі пакойчык. Потым пачаўся голад, і ён мусіў вярнуцца ў родны Мсціслаў, дзе таксама займаўся слясарнай справай.

У 1930-я гг. пачаліся сталінскія рэпрэсіі, дзеда Міцю арыштавалі і адправілі ў лагер. Там супрацоўнікі НКУС забралі яго ў спецкаманду, што ўскрывала металічныя сейфы высокіх савецкіх камандзіраў, якіх масава арыштоўвалі ў 1937 г. Мне ён казаў, што ў тых сейфах нічога сакрэтнага не было: імянная зброя, бутэлька гарэлкі ці каньяку, фотаздымкі сям'і ці службовыя паперы. У часы берыеўскай «адлігі» яго адпусцілі дадому, але пры гэтым моцна збілі і ўзялі падпіску «аб неразгалошанні». Неўзабаве пачалася вайна, у Мсціслаў прыйшлі акупанты і прымусова адправілі дзеда Міцю з жонкай і малой дачкой працаваць на ваенны завод у Заходнюю Германію. Там ён стаў падпольшчыкам і падсыпаў пясок у снарады, каб тыя не ўзрываліся. Яго выдалі, моцна білі гумовымі палкамі па пятах і адправілі ў канцлагер. Жонку таксама арыштавалі, а дачку адправілі ў дзіцячы дом. З палону ў 1945 г. іх вызвалілі амерыканцы і прапанавалі майму сваяку ехаць з сям'ёй (якая выжыла) на працу ў ЗША на адзін з заводаў Форда. Але ён адмовіўся і хацеў вярнуцца на радзіму. Тады яго з сямейнікамі завезлі ва Усходні Берлін і перадалі савецкім уладам, якія дзеда Міцю арыштавалі за тое, што працаваў на немцаў. Яго выратавала даведка аб удзеле ў падполлі, і ён з сям'ёй вярнуўся ў Мсціслаў, у свой дом, які ацалеў, не быў спалены ў 1943 г., як большасць гарадскіх дамоў. З сабой з Германіі дзед прывёз розныя інструменты для працы па метале і меў спецыяльны пакой – майстэрню, дзе на паліцах і сценах віселі ці ляжалі розныя прылады, прывезеныя з Петраграда або з Германіі, якімі дзед карыстаўся і вельмі ганарыўся, калі паказваў іх мне.

Яго самай любімай кнігай была Біблія, што заўсёды ляжала ў спальні, ён любіў чытаць яе перад сном. Дзед Міця быў выдатным садаводам, разводзіў пладовыя дрэвы і кусты, а яго жонка навучыла мяне вырошчваць і любіць розныя кветкі, што я зараз і раблю на сваім лецішчы.

Пад час нямецкай акупацыі ўсе мае сваякі, у тым ліку і мая бабуля з дзвюма дочкамі (старэйшая – мая маці), выехалі з Мсціслава на ўсход. На чыгуначнай станцыі Сухінічы яны трапілі пад жахлівую бамбёжку, і за ёю, калі яна бегла з дзецьмі каля палаючага цягніка, паляваў нямецкі лётчык, які страляў па іх з кулямёта. Каб неяк уратавацца, бабуля з дочкамі схаваліся ў драўляную прыбіральню, якую вораг наскрозь прастрэліў, але ў маіх родных не пацэліў, бо тыя ляжалі на падлозе. Потым лёс закінуў іх спачатку на Урал, у г. Каслі, а потым у далёкі казахскі «аіл» (вёску), дзе жылі адны казахі, і мая бабуля асвоіла казахскую мову і часам казала мне, як некаторыя нашы словы гучаць па-казахску. Калі я на сустрэчы з казахскім амбасадарам у Беларусі расказаў пра гэта, ён вельмі здзівіўся і падарыў мне кнігу Н. Назарбаева пра гісторыю Казахстана, перакладзеную на беларускую мову.

Мая прабабка размаўляла на нашым мсціслаўскім дыялекце, і я, пакуль не пайшоў у рускамоўную школу, не ведаў, што «буракі» – гэта «свёкла», а «гарбуз» – «тыква». Яна ведала сотні беларускіх прымавак, якія штодня ўжывала з кожнай нагоды і вельмі не любіла нецэнзурнай лексікі, якую ў дзяцінстве не чула на мсціслаўскіх вуліцах. У вайну яна мусіла застацца пад акупацыяй, бо мой прадзед, яе муж, быў мабілізаваны на будаўніцтва Беламорканала, адкуль яго прывезлі дадому ўжо бязногім. Усе яе дзеці выехалі з дому, сыны пайшлі на фронт, а яна мусіла застацца з мужам-інвалідам, які памёр зімой 1943 г. Увосень таго ж года немцы ўсіх жыхароў горада, у тым ліку і маю прабабулю, загналі ў так званы «Цялячы роў», над якім паставілі кулямёты, каб страляць па наступаючай Чырвонай Арміі, а значную частку гарадскіх дамоў (у тым ліку і наш) спалілі. Калі прабабка вярнулася, уся наша вуліца ўяўляла сабою вялікае папялішча. Аднак перад пачаткам баёў за горад прабабка здолела закапаць у зямлю самыя каштоўныя ў доме рэчы і асабліва швейную ручную машынку фірмы «Зінгер», якая нашай сям'і пасля вайны вельмі прыдалася. Некаторыя рэчы з гэтай ямы-схованкі трапілі як спадчына і да мяне. Магчыма, пра іх я распавяду на старонках «Краязнаўчай газеты» пазней.

*Алег ТРУСАЎ*



*Злева – мая маці Галіна Мяжэвіч. Побач (унізе) – прабабуля Марыя Драздоўская. Побач з ёй яе дачка Аляксандра. Уверсе (цэнтр) – мая бабуля Ганна Мяжэвіч, побач (справа) яе дачка Жанна*



*Дом маіх продкаў. Мсціслаў (1930-я гады)*

# Прэзентацыя кнігі «Камень-бацька і камень-сын»






У рамках праекта «Гартаючы кнігу Слонімшчыны» дзіцячая раённая бібліятэка запрасіла ў госці на вечар-сустрэчу «Вытокі чалавечага шчасця» нашага земляка, беларускага паэта, літаратуразнаўца, гісторыка, краязнаўца, перакладчыка, журналіста Сяргея Чыгрына. Сустрэча адбылася з нагоды выхаду новай кнігі пісьменніка «Камень-бацька і камень-сын» (Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2021), у якую ўвайшлі легенды і паданні Слонімшчыны, Зэльвеншчыны і Дзятлаўшчыны. На сустрэчы прысутнічалі вучні слонімскай СШ № 2.

Да сустрэчы бібліятэкары падрыхтавалі выставу кніг пісьменніка; аўтар гэтых радкоў распавяла настаўнікам і вучням пра творчасць земляка і пра тыя выданні, што былі выдадзены аўтарам за апошнія пяць гадоў.

С. Чыгрын цікава распавёў прысутным пра сваю новую кнігу, пра тое, што сёння неабходна захаваць духоўныя скарбы нашага народа. *«Мая кніга,* – адзначыў літаратар, – *будзе карыснай, цікавай для ўсіх, каму дарагая родная мова і культура. Яна добры знак таго, што збіральніцкая справа духоўных народных скарбаў у Беларусі працягваецца і яна не заглохла. Гэта свайго роду ўзор для краязнаўцаў, пісьменнікаў, журналістаў і проста для ўсіх беларусаў іншых рэгіёнаў нашай краіны, пачэсны абавязак якіх зрабіць падобнае ў сваіх мясцовасцях».*

Напрыканцы сустрэчы прысутныя пажадалі Сяргею Мікалаевічу творчых поспехаў і плённай працы ў далейшым. А таксама – каб з лёгкасцю адкрываў пісьменніку свае таямніцы наш Слонімскі край.

***Таццяна СЯВЕЦ,***
***загадчыца Слонімскай дзіцячай раённай бібліятэкі***

# Пакуль са мной паэзія…

***10 сакавіка свае юбілеі адзначылі нашы таленавітыя землякі – паэты Мікалай Мінчанка і Галіна Цыганкова. У дзень нараджэння Мікалая Нікіфаравіча і Галіны Віктараўны прыхільнікі іх таленту сабраліся ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І. Пехцерава на творчы вечар.***

Са святам юбіляраў павіншавалі намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Наталля Глушакова і начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Клімавіцкага райвыканкама Вікторыя Пракоф'ева. Ганаровая грамата Магілёўскага аблвыканкама за актыўную грамадскую дзейнасць, значны асабісты ўклад у развіццё і захаванне літаратурных традыцый, духоўна-маральнае і патрыятычнае выхаванне маладога пакалення была ўручана М. Мінчанку, члену Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Г. Цыганкова, адказны сакратар рэдакцыі газеты «Родная ніва», за шматгадовую добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм узнагароджана Ганаровай граматай Клімавіцкага райвыканкама.



*Мікола Мінчанка і Галіна Цыганкова*

Цёплыя словы ў адрас творцаў выказала дырэктар бібліятэчнай сеткі Таццяна Даменікан, галоўны рэдактар раённай газеты Нікіфар Мінчанка, актывіст раённай ветэранскай арганізацыі Ніна Федаровіч, маладая паэтка Ганна Цыганкова і іншыя.

Вершы пра нашу мову, Беларусь, невялікія гумарыстычныя паэтычныя замалёўкі – усё гэта складае аснову творчасці нашых юбіляраў. Вучні клімавіцкай СШ № 3 прачыталі вершы М. Мінчанкі і Г. Цыганковай. Пад час сустрэчы атрымаўся пранікнёны дыялог з публікай пра любоў да роднага краю, мовы, радзімы. Паэты таксама распавялі пра літаратурную дзейнасць, прадставілі свае творы.

А выкладчыкі дзіцячай школы мастацтваў Вікторыя Багамазава і Таццяна Смірнова падтрымалі творчую атмасферу вечара музычнымі нумарамі.

***Марына ШЫЛАВА,***
***загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Пехцерава, г. Клімавічы***



# Радасць духоўнага слова

***Біблія, Святое Евангелле, Псалтыр, Жыціі Святых, Малітваслоў – гэта кнігі ратавання і суцяшэння ў цяжкія хвіліны чалавечага жыцця і ў паўсядзённасці. Дзятлаўская раённая бібліятэка працуе па бібліятэчнай мэтавай праграме «На шляху да духоўнасці». Тут штогод традыцыйна адзначаюць Дзень праваслаўнай кнігі.***

Вось і сёлета 11 сакавіка ў бібліятэцы ладзілі Дзень праваслаўнай кнігі «Радасць духоўнага слова», прысвечаны 1030-годдзю з часу заснавання Беларускай праваслаўнай царквы. У рамках гэтага дня прайшла гадзіна духоўнасці «Каб жыць у веры і еднасці», адбылася сустрэча з клірыкам дзятлаўскага Сабора святых Навамучанікаў і Спаведнікаў Царквы Рускай святаром Аляксеем Сцепановічам. Пад час мерапрыемства ўдзельнікі пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення праваслаўя на беларускіх землях, з галоўнымі праваслаўнымі кнігамі, рэлігійным накірункам у вядомых класікаў літаратуры. Да прагляду была прапанавана выстава-панарама духоўнай літаратуры «Цуды праваслаўя», адбыліся паказы цікавых відэаролікаў «Адраджэнне. Беларускі Экзархат», «Францыск Скарына», прэзентацыі «Дзятлаўшчына праваслаўная».

Напрыканцы сустрэчы айцец Аляксей расказаў, як важна ўмацоўваць веру ў Бога і ў лепшыя чалавечыя якасці, і гэтай размовай выклікаў у душах наведвальнікаў бібліятэкі шмат пазітыўных эмоцый.

***Алена ЯКАЎЧЫК,***
***загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Дзятлаўскай раённай бібліятэкі***



## Сакавік

**25 – Яўневіч Міхаіл Станіслававіч** (1922, Бялыніцкі р-н – 2010), мовазнаўца, заслужаны настаўнік Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990) – 100 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Каўка Аляксей Трафімавіч** (1922, Бярэзінскі р-н – 2012), пісьменнік, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Фаміна Аліна Рыгораўна** (1942), мастак тэатра лялек, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат тэатральнай прэміі імя Л. Мазалеўскай (1992) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**29 – Мартынаў Аляксандр Сяргеевіч** (1947), артыст балета, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**29 – Утораў (Втораў) Барыс Пятровіч** (1932 – 2006), рэжысёр, педагог – 90 гадоў з дня нараджэння.

### Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 10

***Уздоўж***: **1**. Ігнат. **6**. Люты. **8**. Віхура. **10**. Юнак. **11**. Твор. **12**. Маршалак. **15**. Фарс. **16**. Заяц. **17**. Імя. **18**. Паля. **19**. Лета. **20**. Лёд. **22**. Букі. **23**. Ікра. **24**. Грамніцы. **27**. Туба. **29**. Гран. **31**. Раманс. **32**. Хата. **33**. Музей.

***Упоперак***: **2**. Гон. **3**. Аск. **4**. Літр. **5**. Трал. **7**. Юхт. **9**. Францыя. **10**. Юзэфа. **13**. Граматыка. **14**. Замалёўка. **19**. Лібрэта. **21**. Шапэн. **25**. Адам. **26**. Іена. **28**. Акт. **29**. Гну. **30**. Але.

# Краязнаўчы лекторый для дапытлівых

Сёння надзвычай запатрабаваны краязнаўчы лекторый на колах Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі з цыклам экскурсійных турнэ па горадзе і раёне.

Вось і нядаўна сакавіцкім днём у Беразіно на экскурсію завіталі госці з Мазыра. Дзякуючы паслугам мабільнай формы краязнаўча-экскусійнага лекторыя яны змаглі пазнаёміцца з райцэнтрам на Бярэзіне ўвачавідкі, захапляльна і пазнавальна, з уцехай для вока і з карыснай інфармацыяй для дапытлівага розуму. Бібліятэчнаму экскурсаводу ўдалося здзівіць мазыран не стракатасцю гістарычных падзей і датаў на Бярэзіншчыне, а арыгінальнасцю падачы інфармацыі з наведваннем мясцін традыцыйных і месцаў, памятных для кожнага бярэзінца.



Наведванне былых сядзібы і вінакурні графа Патоцкага дазволіла ажывіць падзеі 170-гадовай даўніны, уявіць колішні местачковы побыт, каб пераканацца: краязнаўства – прыступка на ўваходзе ў палац гісторыі.

Помнікі і скульптуры – не проста частка гарадской архітэктуры і эстэтычныя аб'екты, што разнастаяць воблік горада, а зберагальнікі гістарычнай памяці, дзе зніта вана сучаснае і мінулае. Галоўныя святыні – помнік героям і ахвярам вайны, памятны знак у гонар падпольшчыкаў у гарадскім скверы, помнік ахвярам Бярэзінскага гета на вуліцы Інтэрнацыяльнай і воінам-афганцам на ўзгорку пры ўездзе ў горад. Помнік правадыру рэвалюцыі Леніну на цэнтральнай плошчы горада стаў нагодай для размовы пра нараджэнца мястэчка Беразіно, «купца рэвалюцыі» Аляксандра Парвуса. Мемарыяльная дошка ганароваму грамадзяніну Беразіно Міхаілу Хонінаву і бюст героя-пажарнаму Чарнобыльскай АЭС Васілю Ігнаценку сталі адпраўной кропкай для расповеду пра іх легендарнае жыццё-служэнне Айчыне. Знакамі-сімваламі райцэнтра па праве лічацца скульптура Лісу з увасабленнем гербавай сімволікі Беразіно, помнік 23-метровай драўлянай лыжцы-велікану з 300-гадовага дуба, якая на 5 метраў пераўзыходзіць занесеную ў Кнігу рэкордаў Гінеса румынскую лыжку, дэкаратыўныя каменныя скульптуры з увасабленнем моцы дзвюх стыхій – каменя і вады...

Экскурс-турнэ па горадзе паказаў, наколькі багатая гісторыя Беразіно, і ў вачах гасцей з Гомельшчыны чыталася жывая зацікаўленасць пабачаным і пачутым.

*Тамара КРУТАЛЕВІЧ,*
*г. Беразіно*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**РАЗЬБА́ ПА ДРЭ́ВЕ** – спосаб мастацкай апрацоўкі дрэва з дапамогай спецыяльных інструментаў (нажы-разцы, стамескі, сякера, свердзел і інш.); від мастацкай разьбы. Вядомая з даўніх часоў у многіх народаў свету, але з прычыны параўнальнай недаўгавечнасці дрэва зберaглася невялікая колькасць помнікаў. У Беларусі пашыраныя контурная, рэльефная, выемчатая, скразная (ажурная), аб'ёмная разьба па дрэве.

Найбольш старажытная контурная (выконваецца заглыбленымі лініямі на гладкім фоне) і аб'ёмная разьба, сродкамі якой ствараюць драўляную скульптуру. Разныя драўляныя вырабы на тэрыторыі Беларусі вядомыя з канца III – 1-й паловы 2-га тыс. да н.э.; з X – XIII стст. зберагліся шматлікія прылады працы, побытавыя рэчы, аздобленыя арнаментальнай контурнай разьбой; у XVI – XVIII стст. рэльефнай, ажурнай, аб'ёмнай разьбой аздаблялі царскія вароты, алтары і іканастасы, абклады абразоў. У ажурнай разьбе пераважалі кампазіцыі расліннага характару (матывы мясцовай флоры, вінаградная лаза, акант). З канца XIX ст. у народным драўляным дойлідстве пашырана скразная прапілаваная разьба, якой аздабляюць франтоны, карнізы, ліштвы, ганкі сялянскіх хат. Контурнай, выемчатай, аб'ёмнай разьбой упрыгожваюць рэчы сялянскага ужытку (мэблю, прылады працы, посуд). Паліхромная драўляная скульптура XIV – XVIII стст. характарызуецца ўзаемасувяззю з архітэктурай, у ёй адбіліся рысы розных мастацкіх стыляў. Уплыў раманскага мастацтва ў спалучэнні з рысамі італьянскага протарэнесансу і мясцовых мастацкіх традыцый адчувальны ў кампазіцыі «Распяцце» з в. Галубічы Глыбоцкага раёна (канец XIV ст.), выявах св. Міколы з г.п. Шарашова Брэсцкай вобласці (канец XVI ст.), готыкі – у скульптурах Архангела Міхаіла з Шарашова і св. Гжэгаша з Полацка (абедзве 1470 – 1480).



*Фрагмент дэкору прасніцы. Камянецкі раён. Канец XIX ст.*



*Царскія вароты з Віцебшчыны. Дрэва, тэмпера, пазалота. Сярэдзіна XVIII ст.*

***(Працяг артыкула ў наступным нумары)***

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Максім Навумавіч ГАЛЬПЯРОВІЧ.
**Адказны сакратар Алесь Сачанка.**
**Рэдкалегія:** Уладзімір Гілеп (старшыня), Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Радзім Гарэцкі, Ганна Запартыка, Павел Каралёў, Алесь Карлюкевіч, Аляксандра Кравец, Ігар Пракаповіч, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі, Аляксандр Суша.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 16.03.2022
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 92.
Тыраж 417 асобнікаў.